*Гоўзіч І.М.*
***БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА. XI КЛАС***



# ТЭМА 9. РЫГОР БАРАДУЛІН.

1. Працытуйце на памяць афарыстычныя радкі з вершаў Рыгора Барадуліна. Паспрабуйце на іх аснове зрабіць вывад пра асаблівасці барадулінаўскага светаўспрымання.

2. Падрыхтуйце вусныя **паведамленні** на адну з тэм: «Рыгор Барадулін і сучаснасць», «Паэзія кахання Рыгора Барадуліна», «Рыгор Барадулін – майстар метафары», «Мой Барадулін: думкі і назіранні».

3. Паразважайце над пытаннем: Як Рыгор Барадулін раскрывае ў сваіх творах тэму жыцця і смерці? Ці можна назваць яго пазіцыю аптымістычнай? Свае адказы пацвердзіце аналізам твораў.

4. Напішыце **сачыненне** на адну з тэм: «Часовае і вечнае ў творчасці Рыгора Барадуліна», «Шлях да Бога (на матэрыяле апошніх зборнікаў Рыгора Барадуліна “Ксты”, “To Be!”)», «У кожнага свая зямля».

5. **Намалюйце** (вусна) партрэты лірычнага героя паэзіі Рыгора Барадуліна 1960-х і 1990-х гадоў. Як ён суадносіцца з вашым асабістым ідэалам, разуменнем дабра і зла, станоўчага і адмоўнага, вечнага і часовага ў чалавечым жыцці?

6. **Параўнайце** індывідуальныя стылі Р. Барадуліна і М. Танка.

| Пытанні | Максім Танк | Рыгор Барадулін |
|---|---|---|
| Гады жыцця | | |
| Пачатак літаратурнай дзейнасці | | |
| Асноўныя этапы творчасці | | |
| Асноўныя тэмы | | |
| Асноўныя жанры | | |
| Лірычны герой | | |
| Традыцыі і наватарства | | |
| Ацэнка крытыкаў | | |
| Іншае | | |

7. **Выпішыце** радкі з вершаў Рыгора Барадуліна, якія сведчаць пра гуманізм яго пазіцыі, светаадчування.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

8. Што такое аўтарскія неалагізмы. Паспрабуйце **скласці слоўнік аўтарскіх неалагізмаў** Рыгора Барадуліна (на матэрыяле двух зборнікаў).

9. Назавіце вечныя матывы (тэмы) беларускай літаратуры. Чаму яны пераважна маральна-этычныя? Ці можна назваць Рыгора Барадуліна песняром вечных тэм? Паспрабуйце **напісаць верш** на адну з тэм.

10. **Дапамажыце кветцы аднавіць пялёсткі, у якіх пазначаюцца назвы твораў Рыгора Барадуліна:**




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ